Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 33 (646) | Пятніца, 4 лістапада 1966 года. | Год выдання XIX. | Цана 2 кап.






## СВЯТЛО КАСТРЫЧНІКА

Сорак дзевяць год споўнілася нашай Савецкай дзяржаве—першай сацыялістычнай дзяржаве свету. Многа цяжкасцей сустрэлася ёй на гэтым шляху.

Але з усіх цяжкасцей савецкія людзі, якімі кіравала ленінская партыя камуністаў, вышлі пераможцамі. Гэта яскравае сведчанне неўміручасці, творчай дзейнасці ідэй марксізма-ленінізма. Святло Кастрычніка ажывіла вялікія дрэмлючыя сілы працоўных, узняло іх на паўсядзённую героіку у імя свабоды і шчасця. Людзям, якім, па сутнасці, да рэвалюцыі не дазвалялі людзьмі звацца, стварылі цуда. Гэтым цудам з'яўляецца Савецкі Саюз.

І ён цяпер не адзіны. Ужо цэлая вялікая сям'я сацыялістычных краін крочыць па шляху, указанаму Марксам, Энгельсам, Леніным. Святло Кастрычніка пранікла ў самыя глухія куткі зямнога шара. Пад яго ўздзеяннем меняецца аблічча цэлых кантынентаў.

Разам с усім савецкім народам новымі поспехамі ў творчай працы сустракае свята калектыў нашага універсітэта. Ён запэўнівае Камуністычную партыю, урад у сваёй адданасці справе Радзімы—камуністычнага будаўніцтва. Як і раней, яго супрацоўнікі, выхаванцы будуць высока несці сцяг савецкай навукі, вернага служэння народу.

**НЯХАЙ ЖЫВЕ 49-Я ГАДАВІНА ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ!**

**Работнікі навукі і вышэйшых навучальных устаноў! Змагайцеся за далейшы росквіт навукі, за тэхнічны прагрэс! Умацоўвайце сувязі навукі з вытворчасцю! Рыхтуйце спецыялістаў, вартых эпохі камунізма!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 49-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).*

## ВЕЛІЧНЫ ПРЫКЛАД ДЛЯ ЗМАГАРОЎ ЗА СВАБОДУ

У Савецкі Саюз я прыехаў зусім нядаўна. Усё, што бачыў тут, так не падобна на тое, аб чым расказвае лацінаамерыканцам імперыялістычная прапаганда. Ад нас утойваюць дасягненні народаў сацыялістычных краін, асабліва Савецкага Саюза.

Радасна ступіў я на вашу зямлю, адразу ўключыўся ў імклівы паток жыцця савецкага народа. Вашы людзі вельмі гасцінныя, і я адчуваю сябе добра. З пачуццём захаплення слухаю я расказы аб 49-гадовым гістарычным шляху, які прайшла Савецкая краіна. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя — гэта велічны прыклад для усіх змагароў за свабоду і незалежнасць, за лепшае будучае усіх народаў.

Святло ідэй Кастрычніцкай рэвалюцыі у Расіі даўно пранікла на лацінаамерыканскі кантынент, асвяціўшы яго сваімі промнямі. І я веру, што недалёка той дзень, калі мая краіна, Венесуэла, стане таксама свабоднай. Гэтая свбода сёння куецца дарагой цаной. Льецца кроў храбрых венесуэльскіх патрыётаў. Імперыялісты ў саюзе з нацыянальнай буржуазіяй імкнуцца ашукаць наш народ, адцягнуць яго ад рэвалюцыйных ідзей, ад барацьбы. Але мы ведаем і цвёрда перакананы ў тым, што каб перамагчы, трэба змагацца, хоць гэтае змаганне суровае, шматпакутнае. У рашучай барацьбе з імперыялізмам наш народ не адзінокі. Поплеч з ім змагаюцца народы Калумбіі, Перу, Гватэмалы. Яны не апусцяць вызваленчай і караючай шпагі Сімона Балівера да пераможнага канца. На кантыненце разгараецца рэвалюцыйнае полымя.

Я цвёрда упэўнены, што прыдзе час, калі ваш народ і народы іншых свабодных краін атрымаюць брацкія прывітанні ад сацыялістычных краін лацінаамерыканскага кантынента.

Дазвольце перадаць ад венесуэльскай моладзі, усяго венесуэльскага народа гарачае прывітанне і павіншаваць вас, дарагія таварышы, з 49-й гадавінай Вялікага Кастрычніка.

Поспехаў вам, сябры!

Архангель БЕСЕРРА,
венесуэльскі студэнт
1 курса фізфака.



# СУСТРЭЧА З ГЕРАІЧНЫМ МІНУЛЫМ

Калі ў рэдакцыі мяне папрасілі напісаць артыкул у святочны нумар, я доўга думаў, аб чым расказаць. Аб тым, як удзельнічаў у грамадзянскай вайне! Аб тым, як з баямі прышлося прайсці тысячы кіламетраў ў Вялікую Айчынную вайну!

Так, гутарка пойдзе аб гэтым і не зусім аб гэтым. Той, хто ўпершыню наведвае галоўны корпус нашага універсітэта абавязкова затрымліваецца на чацвертым паверсе каля двух вялікіх стэндаў, на якіх дэманструюцца дзесяткі фотаздымкаў навуковых супрацоўнікаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Я часта спыняюся ля стэндаў, і кожны раз гэта з'яўляецца для мяне сустрэчай з гераічным мінулым. З многімі цяперашнімі супрацоўнікамі нашага універсітэта мне прышлося ўдзельнічаць у абароне сёл і гарадоў, змагацца на адных і тых жа франтах. Так, у 1941 годзе я камандаваў артылерыйскім палком у асаджанай фашыстамі Адэсе. Гэты горад рускай славы абаранялі і выхаванцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пад Валгаградам мы былі недзе побач з капітанам Віктарам Рыгоравічам Заўрыевым — цяпер прафесарам геолага-геаграфічнага факультэта. Наогул можна з упэўненасцю сказаць, што прадстаўнікі нашага універсітэта змагаліся супраць фашысцкіх захопнікаў на ўсіх франтах. Яны абаранялі Маскву, адстайвалі Севастопаль; у ліку стойкіх абаронцаў Ленінграда быў цяперашні прафесар нашага універсітэта, а тады камандзір узвода супроцьтанкавых гармат Мікалай Паўлавіч Яругін.

Праславілі сябе ў баях прафесары І. С. Лупіновіч, В. С. Сцяпанаў, І. Г. Некрашэвіч, І. М. Лушчыцкі, дацэнты С. Я. Янчанка, Р. В. Булацкі, М. С. Зярніцкі, Л. А. Міхайлоўскі і многія іншыя. А. А. Філімонаў, Д. П. Жмуроўскі — дацэнты універсітэта, а таксама я — аўтар гэтых радкоў—удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.

Сярод актыўных змагароў за свабоду і шчасце Радзімы мы сустракаем і жанчын. За баявыя поспехі ў Вялікай Айчыннай вайне ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі прафесар Е. П. Чэркасава, дацэнты В. А. Захарава, С. А. Лысенка.

Пасля вайны ва універсітэт не вярнуліся многія яго выкладчыкі і студэнты. Гітлераўцы расстралялі дацэнтаў Е. М. Зубковіча, А. В. Вязовіча, М. Я. Пелепа, Г. Н. Сагаловіча; яны закатавалі старэйшага выкладчыка — прафесара Н. А. Сталярова. Смерцю храбрых на фронце загінуў выкладчык хімфака Пётр Дзмітрыевіч Чугуноў.

Так, вялікія страты панёс наш універсітэт у гады Айчыннай вайны. Яго вучэбныя карпусы, інтэрнаты былі разбураны і аграблены. Адзін толькі матэрыяльны ўшчэнт, нанесены гітлераўцамі універсітэту, перавысіў дзесяткі мільёнаў рублёў.

У савецкіх людзей ёсць добрая традыцыя — ніколі не забываць імёны тых, хто змагаўся за свабоду і шчасце сацыялістычнай Айчыны. Напярэдадні вялікага свята мне і хочацца павіншаваць былых франтавікоў, партызан, пажадаць ім новых поспехаў у выхаванні маладых барацьбітоў за камунізм.

А. В. КІРСАНАЎ,
прарэктар універсітэта,
генерал-маёр у адстаўцы,
Герой Савецкага Саюза.



Вось так, поплеч, настаўнікі са сваімі вучнямі працуюць у лабараторыях. На здымку: выкладчык А. А. Гедройц і студэнт 4-га курса фізфака І. Казлоў у лабараторыі кафедры цвёрдага цела.

## ПАЧЫНУ ХІМІКАЎ— ШЫРОКУЮ ПАДТРЫМКУ

Напярэдадні 49-й гадавіны Вялікага Кастрычніка па ініцыятыве камітэта камсамола вялікая сям'я студэнтаў-хімікаў вышла працаваць на будоўлі горада Мінска, каб уласнымі рукамі зарабіць грошы на рамонт і добраўпарадкаванне свайго інтэрната. Нягледзячы на халодную асеннюю пагоду, да працы прыступіла 400 камсамольцаў. За дзень было зароблена 600 рублёў. Няхай гэта на першы раз яшчэ мала, але тое, што зрабілі хімікі, павінна зацікавіць камсамольцаў і іншых факультэтаў. Дарэчы, ініцыятары гэтай добрай справы звярнуліся з такім заклікам да ўсіх.

На самай справе студэнты могуць многае зрабіць для таго, каб універсітэцкія інтэрнаты сталі лепшымі ў горадзе, каб кожны ў іх адчуваў, як дома. Перш за ўсё трэба падтрымліваць належную чысціню, берагчы дзяржаўную маёмасць. Але будзе добра, калі самі студэнты ўнясуць таксама значны ўклад у рамонт інтэрнатаў. Хімікі зрабілі першы крок да гэтага. Крок аказаўся плённым. 400 камсамольцаў за адзін толькі дзень зарабілі 600 рублёў. А калі на нядзельнік выйдуць усе студэнты універсітэта—пяць, шэсць тысяч юнакоў і дзяўчат? Не трэба ведаць вышэйшую матэматыку, каб падлічыць вялізарную выгаду такой дапамогі для універсітэта.

Пачыну хімікаў — шырокую падтрымку!

## ДАРОГА ПРАЦЫ, СУМЛЕННЯ, БАРАЦЬБЫ

ДАЦЭНТА Мацвея Якаўлевіча Рэзнікава добра ведаюць не толькі на фізічным факультэце. Яго лекцыі з цікавасцю слухаюць рабочыя, служачыя, калгаснікі і воіны. Многія студэнты выконвалі пад яго кіраўніцтвам курсавыя ці дыпломныя работы або проста прыходзілі параіцца па розных пытаннях жыцця, часам такога складанага...

І вось нядаўна я зайшоў да Мацвея Якаўлевіча з просьбай падзяліцца ўспамінамі аб пражытых гадах. Гэта былі нялёгкія для Мацвея Якаўлевіча ўспаміны, бо многа прышлося перажыць, многа страціць верных баявых сяброў... Ледзь пераадолеўшы хваляванне, Мацвей Якаўлевіч пачаў свой расказ, які час ад часу перапыняўся, і я адчуваў, што ў гэтыя моманты перад яго вачыма паўставалі карціны цяжкіх дзён.

ПЕРАД пачаткам вайны Мацвей Якаўлевіч працаваў старшым выкладчыкам фізічнага факультэта і адначасова быў загадчыкам спецлабараторыі, якая выконвала заданні нашай прамысловасці.

У першы ж дзень вайны ён з'явіўся ў ваенкамат, папрасіў накіраваць на фронт. Быў назначаны ад'ютантам начальніка штаба разведвальнага батальёна танкавай дывізіі. З цяжкімі баямі дывізія адыходзіла на ўсход, а каля Магілёва трапіла ў акружэнне. Групамі пачалі прарывацца ў напрамку да Гомеля. У адным з баёў Мацвей Якаўлевіч быў ранены ў нагу і трапіў у палон. Наперадзе быў канцлагер — спачатку ў Стара-Быхаве, пасля ў Мінску. У канцлагеры Мацвей Якаўлевіч прабыў усяго некалькі тыдняў, але гэтыя тыдні былі самымі жудаснымі ў яго жыцці.

З МІНСКАГА канцлагера Мацвею Якаўлевічу ўдалося ўцячы разам з батальённым камісарам Новікавым, а неўзабаве і наладзіць сувязь з партызанамі. Да самага вызвалення Мінска ён ваяваў у саставе 3-яй Мінскай партызанскай брыгады, якая дзейнічала ў раёне Канкоўскі лес—Пухавічы — Грэск — Рудзенск — Шацк. Многа разоў Мацвей Якаўлевіч удзельнічаў у засадах, разгромах варожых гарнізонаў, у дыверсіях на чыгунцы. Акрамя гэтай асноўнай работы, ў Мацвея Якаўлевіча было і грамадскае даручэнне: разам з камандзірам узвода ён рэдагаваў партызанскую газету, у якой змяшчаліся цікавыя артыкулы аб барацьбе лясных мсціўцаў з лютым ворагам.

КАЛІ ў 1944 годзе Мінск быў вызвалены ад фашысцкіх захопнікаў, Мацвея Якаўлевіча накіравалі ва універсітэт прарэктарам па завочнаму навучанню. Тады ўсе універсітэцкія будынкі ляжалі ў руінах. Адны толькі сцены засталіся ад біялагічнага і хімічнага карпусоў. Больш-менш захаваўся толькі корпус фізіка-матэматычнага факультэта.

Мацвею Якаўлевічу разам з прарэктарам па навуковай рабоце прафесарам М. Е. Макушок таксама прышлося выносіць смецце, шкліць вокны, рабіць электрычную праводку. Сярод руін збіралі інструмент і часткі ад прыбораў, якія яшчэ можна было скарыстаць пры аднаўленні лабараторый.

АМАЛЬ на кожным прадпрыемстве Мінска, у многіх падшэфных калгасах і саўгасах, у вайсковых падраздзяленнях ведаюць гэтага чалавека. Ён часта прыходзіць да іх, каб прачытаць лекцыю аб слаўнай гісторыі Камуністычнай партыі, аб стваральнай працы савецкага народа, аб міжнародным становішчы. Цяжка пералічыць тыя тэмы, на якія Мацвею Якаўлевічу прыходзіцца чытаць свае лекцыі. Тут няма нічога дзіўнага, бо пачаў ён сваю прапагандысцкую дзейнасць яшчэ задоўга да Вялікай Айчыннай вайны, быў адным з ініцыятараў арганізацыі універсітэцкага таварыства «Веды», а цяпер вось ужо пяты год з'яўляецца старшынёй яго праўлення.

В. ГРАКАЎ.

## КАСТРЫЧНІЦКІЯ ЧЫТАННІ

*Дзесяткі прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта прынялі ўдзел у Кастрычніцкіх чытаннях, якія праводзіліся ў Мінску напярэдадні свят.*



*Кастрычніцкія чытанні арганізаваны і ў самым універсітэце. Перад калектывам з дакладам выступіў акадэмік АН СССР І. І. Мінц. Вы яго і бачыце на нашым здымку.*



*XXVI прафсаюзная*

# ПАТРЭБЕН АСАБІСТЫ ПРЫКЛАД КОЖНАГА

Перад кастрычніцкімі святамі грамадскія арганізацыі падводзяць вынікі сваёй работы за год. Дэлегаты прафсаюзнай арганізацыі нашага універсітэта, у якой налічваецца 6.340 чалавек, сабраліся на XXVI-ю канферэнцыю, каб у прынцыповай гутарцы абмеркаваць галоўны напрамак сваёй работы: пытанні вучобы, арганізацыі побыту і адпачынку студэнтаў. Старшыня прафкома універсітэта В. З. Рабушка ў справаздачы падрабязна гаварыў аб тым, што прафсаюзнай арганізацыяй шмат увагі ўдзялялася стварэнню неабходных умоў для нармальнай вучобы студэнтаў. У кожным інтэрнаце маюцца добра абсталяваныя ленпакоі, у карпусах — цудоўныя чытальныя залы, кабінеты, лабараторыі, дзе можна сістэматычна працаваць над павышэннем свайго культурнага і навуковага ўзроўню. Але не ўсе студэнты ацэньваюць гэта. Так, Драгун (фізфак), Шорыц (біяфак), Навіцкая і Ступак (філфак), карыстаючыся адкрытым доступам да кніжнага фонду, вынеслі вучэбнікі з чытальнай залы. А яны ж добра ведаюць, што гэтыя кніжкі патрэбны іх таварышам. Студэнту другога курса матэматычнага факультэта Турко аб'яўлена вымова за пакражу кніжак. Гэта непрыемныя факты ў нашым жыцці, з імі трэба весці бязлітасную барацьбу.

На канферэнцыі адзначалася, што такія студэнты, як Алеколева, Блінер, Зальцмн, Ішына, В'юн і іншыя, відаць, выпадкова трапілі ва універсітэт, таму што вучоба іх не цікавіць. Студэнт Плінер мае, напрыклад, тры «хвасты», займаецца падманам. Нажаль, такія студэнты ёсць яшчэ на ўсіх факультэтах.

Камуністычная партыя ўдзяляла і ўдзяляе вялікую ўвагу выхаванню савецкай моладзі ў духу камуністычных адносін да працы, у імкненні жыць і працаваць па-камуністычнаму. У адпаведнасці з гэтымі задачамі і будаваў сваю работу прафком універсітэта. Формы і метады выхаваўчай работы былі самымі разнабаковымі. Асаблівая ўвага ўдзялялася выхаванню студэнтаў на слаўных баявых і працоўных традыцыях нашага народа. Гэта дало значны плён. Але ў выхаваўчай і культурна-масавай рабоце ў нас усё ж маюцца недахопы. Студэнты фізічнага факультэта Гусеў (II курс) і Турбікаў (III курс) у п'яным выглядзе былі затрыманы супрацоўнікамі міліцыі і пасаджаны ў выцвярэзнік, з якога нядаўна вярнуўся і студэнт філфака В. Сініца. Выхаванец юрыдычнага факультэта Дзем'яновіч пасля таго, як «смакануў саракаградуснага напітку», учыніў дэбош у інтэрнаце. Прычым, ён настолькі «расхадзіўся», што яго прышлося скруціць вяроўкамі і такім чынам утаймаваць яго «гарачку». Думаеце, што аб гэтым не ведаюць камендант і студсавет? Ведаюць, але меры яшчэ прымаюць недастатковыя.

Крытыка ў іх адрас была справядлівай.

Цяжка ўявіць сабе і тое, што Васільеў і Шульгін, студэнты пятага курса фізічнага факультэта, апынуўшыся ў час заняткаў на Камароўскім рынку, добра там выпілі і збілі 13-гадовага хлапчука. А яны ж неўзабаве атрымаюць дыплом аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы.

Трэба сказаць, што супраць праяўлення падобных фактаў вялася барацьба, але яна, як адзначалася на канферэнцыі, была яшчэ недастатковай. Трэба больш патрабавальна адносіцца да тых, хто парушае дысцыпліну, нормы нашай маралі.

Спрэчкі дэлегатаў насілі характар прынцыповых прапаноў, заўваг аб рабоце прафкома. Яны былі накіраваны на тое, каб выкрыць усё адмоўнае, ацаніць дадатнае, дапамагчы нова-выбранаму камітэту павысіць актыўнасць членаў прафсаюзнай арганізацыі.

— Без належнай палітычнай падрыхтоўкі, без выхавання маральных якасцей, — падкрэсліў у сваім выступленні прарэктар па вучэбнай рабоце доктар фізіка-матэматычных навук Л. В. Валадзько, — не можа быць усебакова развітага спецыяліста. Нам неабходна штодзённа думаць аб гэтым, змагацца за тое, каб кожны выпускнік універсітэта, дзе б ён ні працаваў, заставаўся прыкладам для іншых, ён павінен знаходзіцца ў першых шэрагах будаўнікоў камуністычнага грамадства.

У. Т. Воднеў, намеснік дэкана матфака, і іншыя дэлегаты указалі, на тое, што ў газеце «Беларускі універсітэт» дапускаюцца некаторыя памылкі, слаба асвятляецца прафсаюзнае жыццё.

Шмат слушных прапаноў выказалі выступіўшыя ў спрэчках прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы А. В. Кірсанаў, студэнт матфака І. Г. Баярчук, камендант інтэрната № 4 Г. М. Рабцэвіч, старшыня спартыўнага клуба М. А. Шэйнеман, член прафкома В. А. Макарчанка і іншыя.

Канферэнцыя выбрала новы састаў прафкома, старшынёй якога стаў В. З. Рабушка.

Л. ХОМЧАНКА.

# МІНСК — ПЕРАДСВЯТОЧНЫ

*Працоўныя сталіцы Беларусі заканчваюць апошнія прыгатаванні да вялікага свята. Упрыгожваюцца вуліцы, плошчы фабрык, заводаў і навучальных устаноў. Разам з усімі ўрачыста адзначыць юбілей Кастрычніка рыхтуецца і калектыў нашага універсітэта. У актавых залах факультэтаў праходзяць святочныя вечары і сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі, знатнымі людзьмі краіны. У карпусах універсітэта з'явілася шмат новых стэндаў, цікавых фотавыставак. Юрысты, напрыклад, расказваюць пра лепшых выпускнікоў свайго факультэта, якія сталі высокакваліфікаванымі спецыялістамі; філолагі — умела адлюстравалі жыццё і дзейнасць камсамольцаў... Кожны факультэт спаборнічае за лепшы паказ сваіх поспехаў у вучобе, навуковых даследаваннях, ва ўмацненні сувязей з вытворчасцю.*

*Усё падрыхтавана і да дэманстрацыі — лозунгі, транспаранты, сцягі. Напярэдадні свята наш фотакарэспандэнт А. Кадзет зазняў Цэнтральную плошчу Мінска (справа), а таксама універсітэцкае танцавальнае трыё, якое выступіць на плошчы ў час дэманстрацыі.*





# СЛЯДЫ Ў СТЭПЕ

**Тыя мясціны назаўсёды засталіся жыць у яго ўспамінах, як самае незабыўнае, радаснае і хвалюючае. Хто ведае, можа з той пары і пачала нараджацца ў яго характары яшчэ адна выдатная рыса — настойлівасць. Цаліна — невялікі адрэзак жыцця Сашы Камароўскага. Гэта яшчэ адзін цвёрды, упэўнены, самастойны яго крок...**

**Сонца прыемна лашчыць твар казаха-аксакала... Немнагаслоўны, ён расказвае новаму знаёмаму з Беларусі пра свой край. Кароткія, але ёмістыя фразы, шмат алегорый. Стары усміхнуўся і паказаў на неба. Там кружыўся стэпны арол. Казах працягвае сваю гаворку. Кажуць, у арла затаілася на людзей помста. Яны засялілі іх «арлінуую» тэрыторыю, парушылі спакой. Тут некалі толькі сядытады бывалі людзі, ніхто не турбаваў арлоў...**

Саша Камароўскі на цаліне ўпершыню. Стэп, людзі неяк па-свойму здаюцца прыгожымі і ажыўленымі, хочацца на усё паглядзець сваімі вачыма.

Пасля першага дня працы балелі рукі, ныла спіна, але ён пайшоў да сваіх новых сяброў, каб паслухаць навіны, расказаць ім пра сваю родную старонку.

Брыгадзір Барыс Плотнікаў адразу прыкмеціў, як стараецца ў працы Саша. Бывала, што хацелася нават сказаць хлопцу:

— Прысядзь, адпачні...

Але Саша не звяртаў увагі на прапанову камандзіра і працягваў працаваць. Яму заўсёды здавалася, што ён рабіў за змену менш, чым іншыя. На самай справе, ён перавыконваў штодзённа нормы.

Калі Іван Белы і Анатоль Тарасевіч устанавілі рэкорд раёна па прыгатаванню самана (1600 на дваіх у дзень), Камароўскі захапляўся гэтым, расказваў кожнаму, а пра сябе, ні слова, хоць...

Цаліннікі добра ведаюць, што прыгатаванне саману — гэта цяжкая праца. Тут могуць вытрываць толькі тыя хлопцы, якія маюць добрую фізічную загартоўку. Можа таму так паспяхова і ішлі справы ў брыгадзе, што кожны з яе членаў быў спартсменам. Студэнт—філолаг Саша Камароўскі не раз хадзіў у «перадавых» таксама.

Часта хлопцам здаралася працаваць і ноччу. Аднаго разу прыходзіць камандзір атрада Алег Слука і кажа, што трэба тэрмінова разгрузіць цэмент. Хто жадаючы?

— Мы пойдзем,— адазваліся Іван Белы і Саша Камароўскі. — Калі трэба, дык трэба.

І пайшлі працаваць нашы хлопцы. Ноч халодная, але гарачая праца не давала замерзнуць. На твары выступілі кроплі поту. Праз некаторы час восем тон цэменту было выгружана.

А ранкам зноў за работу. І так заўсёды...

Канец працоўнага дня. Хлопцы і дзяўчаты ідуць дадому, а насустрач ім бягуць мясцовыя хлапчукі. Яны просяць, каб ім пасудзілі матч вулічных каманд. Ну як тут не згадзіцца, калі ў самых «суддзяў» дрыжыць сэрца, як толькі пачуюць гулкі стук мяча. Тут ужо забываешся аб стоме. І гэтая стома пасля ўжо сама злятае з малайцоўскіх плячэй.

Дні праходзяць хутка. Неяк нечакана надышоў час ад'езду. Вышлі хлопцы за ваколіцу — і самі здзівіліся — новыя будынкі ярка выдзяляліся сярод абжытых дамоў. Так, гэта іх след. Выразны след у стэпе. А колькі такіх слядоў пакінулі студэнты нашага універсітэта ў Казахстане, Сібіры, нават у Польшчы і Чэхаславакіі? Многа. Гэта іх падарункі Радзіме.

Ю. АГАРАДНІЧЭНКА.



**БЛІСКУЧЫ ПОСПЕХ СТУДЭНЦКАГА ТЭАТРА**

# «ВЕСТСАЙДСКАЯ ГІСТОРЫЯ» ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

*У старажытных грэкаў быў яркі тэрмін — катарсіс, што азначае ачышчэнне. Гэта твор мастацтва, які застаўляе гледача хвалявацца, ачышчае яго душу, узбуджае і выхоўвае яго. Вось такое адчуваеш, калі глядзіш пастаноўку А. Лаўрэнтса «Вестсайдская гісторыя» у выкананні студэнцкага тэатра нашага універсітэта.*

*Так, яшчэ адзін мастацкі калектыў зрабіў свой першы крок! Скажу адразу: гледачам нарэшце адчыніліся доўгастрымліваемыя шлюзы — мы ўбачылі сапраўдную артыстычнасць. Менавіта таму ў час прадстаўлення ўспыхвалі штохвілінныя апладысменты. У канцы пастаноўкі самадзейным артыстам гледачы паднеслі горы кветак, торт, шампанскае. І былі... слёзы. Слёзы радасці за свой поспех. Яны бачны былі ў Тані Галынка, выканаўцы галоўнай ролі, і ў Аляксандра Міхайлавіча Озерава, кіраўніка калектыву студэнцкага тэатра.*

*Але вернемся да тых хвілін, калі пачаў адкрывацца занавес.*

*— Банкі... нажы... рэвальверы!..*

*— Бойка... заўтра...*

*Іх — трыццаць. Трыццаць маладых хлопцаў, якія вырашылі толькі бойкай уладкавацца і стаць гаспадарамі вуліц горада. Бойка — сэнс пастаноўкі, але галоўнае— расказ пра вялікае, чыстае каханне, адказнасць чалавека не толькі за свой лёс, але і за лёс сваіх сяброў, з якімі жывеш на адной вуліцы.*

*Пачатак пастаноўкі, а ўжо чуюцца апладысменты. Як жа будзе развівацца дзеянне далей? Атрымалася тое, чаго мы ўсе чакалі, на што надзеяліся. Яшчэ гучней апладыруе зала. Але цяпер — у гонар дваіх: «першая сустрэча Тоні і Марыі». Незвычайна! Гэтыя галоўныя ролі выконваюць студэнт геолага-геаграфічнага факультэта Валодзя Сячэйка і студэнтка гістарычнага факультэта Таня Галынка. У іх абодвух вялікае будучае. Здзіўляюча паакцёрску вядуць яны сябе на сцэне.*

*Вельмі цяжка пераказаць сюжэт гэтай пастаноўкі, яе асобныя сцэны, і не таму, што ў ёй няма цэльнага, закончанага сюжэта, а таму, што словамі гэтага не выразіш. Можна расказаць аб тым, як зроблен эпізод, як праходзіла бойка, ці сцэна забойства Тоні, але гэта будуць «драўляныя» словы, а калі ўбачыш — нельга не паражыць.*

*Фінальная сцэна—рэдкая па сіле эмацыянальнага ўздзеяння (сапраўды, катарсіс!). Сабраўшыся, юнакі адной і другой вуліц нясуць забітага імі Тоні. Толькі вось у гэты момант яны пазналі сэнс сяброўства, сэнс жыцця. Цяпер яны цвёрда ўпэўнены, што «чалавек чалавеку воўк» — гэта не іх філасофія.*

*Ці бывае так у жыцці моладзі капіталістычнай краіны? Бывае, але да такіх вывадаў многія прыходзяць вельмі цяжкім шляхам. Так адбылося з героямі п'есы.*

*Сіла і мастацкая каштоўнасць у тым, што выканаўцы роляў паверылі ў жыццёвую праўду пастаноўкі, падышлі да ўвасаблення падзей і вобразаў не з пазіцый літаратурных асацыяцый і догмаў, а суаднеслі праўду тэатральную з праўдай жыцця.*

*Ці ёсць у спектаклі недахопы? Ёсць. Але яны не маюць прынцыповага значэння ў параўнанні з тым майстэрствам, якога дасягнуў студэнцкі тэатр у сваім першым выступленні.*

*Калі вы спытаеце ў мяне, чыя ігра мне спадабалася найбольш, я не адкажу вам на гэта. Вельмі цяжка вызначыць лепшага з лепшых. Усе— ма-лай-цы!*

*Сапраўды, яны па праву заслугоўвалі штохвілінных апладысментаў і многагалосае «Дзякуй!», якое скандыравала ў канцы пастаноўкі ўся актавая зала універсітэта.*





*НА ЗДЫМКАХ: (справа) студэнтка Таня ГАЛЫНКА ў ролі Марыі, (унізе) сцэна сустрэчы Тоні і Марыі.*

*Фота і тэкст А. КАДЗЕТА.*

# БЕЛАРУСКІ, ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ

**З ВЫПАДКУ ЗНАМЯНАЛЬНАЙ ПАДЗЕІ** ў жыцці савецкага народа малійскія студэнты горача віншуюць яго студэнтаў і выкладчыкаў. Мы жылі і вучыліся ў вашым універсітэце на падрыхтоўчым факультэце ў розных вучэбных групах. Рускую мову выкладалі нам Ала Сяргееўна Ляцецкая, Галіна Адольфаўна Берзіна і Аляксандра Аляксееўна Ладзік. Мы памятаем іх, як задушэўных і шчырых людзей, якія ўсё рабілі для таго, каб мы паспяхова вучыліся. Дзякуючы ім і кафедры прыродазнаўчых дысцыплін факультэта, зараз мы паспяхова займаемся па выбранай намі спецыяльнасці прамыслова-грамадскага будаўніцтва на II курсе Мінскага архітэктурна-будаўнічага тэхнікума.

Ад душы вітаем усіх супрацоўнікаў, савецкіх і замежных студэнтаў у дзень слаўнага Кастрычніка, жадаем вялікіх поспехаў у працы і вучобе.

Секу САКО,
Дауда СІССОКА,
Модзі Н'Дзіаўе ГІРАНДУ,
малійскія студэнты Мінскага архітэктурна-будаўнічага тэхнікума.

□ □

**МЫ — БУДУЧЫЯ МЕДЫКІ,** урачы. З універсітэтам нас звязвае не толькі тое, што першыя крокі ў навуку зрабілі ва універсітэце, што ў нас так многа сяброў, што нават нашы вучэбныя карпусы побач. Нас звязвае сама гісторыя універсітэта. Бо медыцынскі інстытут узнік на базе медыцынскага факультэта універсітэта. БДУ і цяпер не дае нам сумаваць; нас часта запрашаюць ва універсітэт на сустрэчы, канцэрты, вечары адпачынку. Часта ў час летніх канікулаў адпачываем ў спартыўна-аздараўленчым лагеры універсітэта ля возера Нарач.

Пройдуць гады. Вырастуць непамерна шэрагі выхаванцаў універсітэта. Раз'едуцца яны ў розныя мясціны свету. Мы таксама паедзем у свае краіны. Але я ўпэўнены, што наш родны універсітэт назаўсёды застанецца ў памяці, як цудоўны храм вучобы, жыцця ў цудоўнай краіне.

Альфонс БУТЭРА,
студэнт Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута.

# БЯСКОНЦАЯ СТАРТАВАЯ ДАРОЖКА

Да 1929 года фізічнае выхаванне ў вну краіны праводзілася ў форме абавязковай дапрызыўнай ваенна-фізкультурнай падрыхтоўкі. 19 ліпеня 1929 года СНК РСФСР прыняў пастанову аб увядзенні фізічнай культуры ў вучэбныя планы ўсіх вышэйшых навучальных устаноў. З гэтага часу фізічная культура ўваходзіць у праграму навучання студэнтаў у якасці вучэбнага прадмета.

З першага года заняткаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце самадзейная масавая спартыўная работа развіваецца ў спартыўных студэнцкіх секцыях і гуртках. Найбольшай папулярнасцю карысталіся гурткі па лёгкай атлетыцы і падняццю цяжкасцей. Хутка традыцыйнымі сталі масавыя выезды ў выхадныя дні за горад, у час якіх арганізоўваюцца спаборніцтвы на лепшага бегуна, скакуна, кідальніка мяча і так далей.

Работа са студэнтамі ў гімнастычным гуртку і секцыі лёгкай атлетыкі праводзіліся пад кіраўніцтвам актывістаў, студэнтаў фізіка-матэматычнага факультэта Казлоўскага, Кемельцэрзона і іншых.

Афіцыйныя спаборніцтвы ва універсітэце былі праведзены ў 1927 годзе па лёгкай атлетыцы і баскетболу. Першае месца сярод жаночых каманд заняла каманда медыцынскага факультэта, сярод мужчынскіх — каманда фізіка-матэматычнага факультэта.

У сувязі з падрыхтоўкай да першай Усесаюзнай спартакіяды 1927 года да універсітэта былі замацаваны трэнеры рэспублікі Камароўскі і Тайц. Год плённай работы даў добрыя вынікі. У склад зборных каманд рэспублікі увайшло 11 студэнтаў універсітэта, сярод якіх былі М. К. Шыдлоўскі, І. Г. Некрашэвіч і іншыя. З кожным годам усё больш і больш студэнтаў універсітэта прыцягвалася да масавых спартыўных мерапрыемстваў, усё больш сіл набіраўся яго спартыўны калектыў, часцей і часцей спартсмены універсітэта выходзілі пераможцамі ў спаборніцтвах горада і рэспублікі.

Але асабліва добра вядомы ў Беларусі і за яе межамі спартсмены БДУ ў наш час. У спартыўным калектыве універсітэта, які з'яўляецца адным з вядучых сярод вну нашай рэспублікі, налічваецца каля пяці тысяч студэнтаў. Яны рэгулярна займаюцца ў секцыях па 24 відах спорту.

Фізічнае выхаванне і спорт з'яўляюцца верным памочнікам у вучобе студэнтаў. Многія вядучыя спартсмены універсітэта цесна спалучаюць вучобу з рэгулярнымі заняткамі спортам. Гэта майстры спорту М. Валахановіч, А. Антаневіч, Т. Філонава, Л. Кулік, першаразрадніца М. Талочка і многія іншыя. Многія спартсмены пасля заканчэння універсітэта застаюцца тут жа працаваць. Гэта І. Неманава, А. Паўлючэнка, Г. Даўгяло, Ул. Ціток, І. Сокалаў, Р. Рабцэвіч. Паступілі ў аспірантуру майстры спорту А. Антаневіч, Л. Літвінава, кандыдат у майстры А. Ксенафонтаў, О. Кузнечык. Закончылі аспірантуру і паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі першаразраднікі па спартыўнай гімнастыцы Э. Шчукіна, па лёгкай атлетыцы Ул. Ціток, Л. Станішэўскі, А. Паўлючэнка, Г. Даўгяло і іншыя.

Калектыў універсітэта ганарыцца тым, што ў ім выхаваўся вядомы спартсмен Савецкага Саюза, прызёр XVIII Алімпійскіх гульняў у Рыме майстар спорту Уладзімір Гараеў.

У спартыўным калектыве нашага універсітэта ў цяперашні час 37 майстроў спорту, 302 спартсмены першага разраду і 2174 спартсмены другога і трэцяга разрадаў.

Рыхтуючы дастойную сустрэчу 50-годдзю Савецкай улады, мы поўны рашучасці дабівацца новых вышынь спартыўнага майстэрства, масавага ахопу студэнтаў заняткамі фізічнай культуры і спорту. Толькі фізічна добра развіты, здаровы чалавек можа добра працаваць, вучыцца і займацца навуковай дзейнасцю.

В. ШЭПЯЛЕВІЧ,
загадчык кафедры фізвыхавання і спорту.

# З ПЕРАМОГАЙ ВАС, ЧЭМПІЁНЫ!

16 мацнейшых каманд вышэйшых навучальных устаноў Савецкага Саюза па шашках сустрэліся ў фінале. Сярод удзельнікаў было 30 майстроў спорту. Асабліва моцнымі былі каманды мінулагодніх чэмпіёнаў Харкаўскага інжынерна-будаўнічага і Ленінградскага механічнага інстытутаў, у склад якіх уваходзілі толькі майстры спорту. Першынство праводзілася па той жа сістэме, што і чэмпіянат па футболу ў Англіі.

Наша каманда трапіла ў адну з мацнейшых груп: Харкаўскі дзяржаўны універсітэт, Адэскі тэхналагічны і Казанскі інжынерна-будаўнічы інстытуты. Гэта былі дастойныя сапернікі. Асабліва цяжкім быў матч з адэсітамі, у якіх мы выйгралі з мінімальным лікам $3^1/_2:2^1/_2$. Атрымаўшы перамогу ў астатніх матчах, мы з 12 ачкамі занялі першае месца ў турнірнай табліцы. Другімі былі адэсіты. У чвэрцьфінале мы сустрэліся з Томскім політэхнічным інстытутам. Перавага была то ў адной каманды, то ў другой. Толькі праявіўшы выключнае майстэрства, нашы шашысты вышлі ў паўфінал, дзе сустрэліся з мінулагоднім чэмпіёнам Харкаўскім інжынерна-будаўнічым інстытутам. З лікам 4:2 мы разграмілі сваіх сапернікаў. З такім жа лікам шашысты Горкаўскага універсітэта выйгралі ў прадстаўнікоў Ленінградскага механічнага інстытута. І так, у фінале сустрэліся дзве універсітэцкія каманды. Пераможца чакалі адразу два прызы: Кубак вну СССР і Кубак універсітэтаў.

Добра падрыхтаваўшыся да сустрэчы, нашы шашысты літаральна разграмілі сваіх сапернікаў з лікам $4^1/_2:1^1/_2$. Самая маладая сярод вну рэспублікі каманда шашыстаў нашага універсітэта ўпершыню ў гісторыі стала чэмпіёнам Савецкага Саюза. У саставе каманды выступалі: двухразовы чэмпіён Беларусі Лена Сорціна, чатырохразовы чэмпіён СССР сярод юнакоў Анатоль Гантварг, чэмпіён БССР Генадзь Хацкевіч, фіналіст першынства СССР Міхаіл Кац, пераможца студэнцкага першынства СССР Якаў Кухарчук, прызёр першынства Беларусі сярод студэнтаў Барыс Агашын, чэмпіён Беларусі сярод студэнтаў Уладзімір Беглеўскі—усе матэматыкі. Свой спартыўны поспех яны прысвячаюць святу Кастрычніка.

Г. ДРАБУШЭВІЧ.

Рэдактар М. І. ЮСЬКА.

АТ 08029 Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 108, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1382.